Упраўленне па адукацыі, спорце і турызме Уздзенскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Хатлянская сярэдняя школа" Уздзенскага раёна

РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС-ТУРНІР
"ДЗІВОСЫ КРАЮ МАЙГО"
у рамках рэспубліканскага
грамадзянска-патрыятычнага праекта
"Збяры Беларусь у сваім сэрцы"

# "Хатлянскімі сцяжынкамі"



Падрыхтаваў: Селівончык Максім, 9 клас
Кіраўнік: Мяцілка Алена Леанідаўна,
настаўнік геаграфіі

# 1.Свята-Пакроўская царква

Мой Храм мяне сустрэне цішынёй,
Дзе свежае паветра - старажытных сцен прахалода,
Уся мітусня засталася за спіной,
Стомленай душы царква - узнагарода



Гэтыя прыгожыя словы вельмі добра падыходзяць да Свята-Пакроўскай царквы, якая знаходзіцца ў вёсцы Хатляны Уздзенскага раёна. Яе асаблівасць у тым, што гэта адзіная пяцікупальная драўляная царква ў Беларусі. Спраектаваў новую царкву архітэктар Канстанцін Тон. Менавіта ён з'яўляецца аўтарам праекта храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве.

У 1930 годзе царква была закрыта і аддадзена пад зернясклад, крыжы зрэзаны, званы вывезены. А між тым, у 1987 годзе Хатлянская царква была ўзята пад ахову дзяржавы як помнік драўлянай архітэктуры XIX стагоддзя.



Цяжкі лёс у помнікаў драўлянай архітэктуры. Разбуральная плынь часу і агні пажарышчаў, войны знішчылі дзесякі і сотні цудоўных помнікаў архітэктуры. Не абышла бяда і нашу прыгажуню... Напярэдадні Раства Хрыстова, у ноч з 6 на 7 студзеня 2013 года, адбылася вялікая трагедыя: пажар знішчыў Свята-Пакроўскую царкву.



Трагедыя аб'яднала людзей і дала новыя сілы для таго, каб храм падняўся з папялішча. На сённяшні дзень, дзякуючы ахвяраванням, сабранымі прыхаджанамі і ўсімі людзьмі, якія не засталіся абыкавымі да гэтай трагедыі, царква адроджана і гарыць незгасальнай зоркай веры ў людское дабро.

## 2.Сядзібна-паркавы комплекс памешчыка Грабоўскага



Размешчаны ў в.Таўкачэвічы Уздзенскага раёна. Пабудаваны ў 1 - палове XIX стагоддзя. З’яўляецца помнікам сядзібна-паркавай архітэктуры XIX стагоддзя. Парк з векавымі дрэвамі і гаспадарчымі пабудовамі застаўся ў спадчыну ад багатага маёнтка графа Грабоўскага, які належыць да вядомага дваранскага роду, які меў польскія карані. На тэрыторыі сядзібы да цяперашняга часу захаваліся старадаўнія гаспадарчыя пабудовы, свіран (амбар), стайня (канюшня). Цагляны двухпавярховы свіран (амбар) з трапецападобнай дахам і паўцыркульным акном, невялікімі вокнамі на фасадах ў абрамленні аздаблення з белай цэглы, знаходзіцца ў больш добрым стане, ён стаіць у асяроддзі клёнаў. Былыя стайня (канюшня) і гаспадарчая пабудова - 1-павярховыя каменныя, знаходзяцца ў аварыйным стане. На жаль, галоўны дом сядзібы Грабоўскага, не захаваўся.



Плошча парка складае каля 6 га. Дрэвы прадстаўлены ясенем, грабам, вязам шурпатым, клёнам, дубам, елкай, алешынай, таполяй белым і інш. Адзінкавыя дрэвы дасягаюць вышыні 30 м і больш. У парку расце дуб з двума стваламі вышынёй больш за 28 м. і дыяметрам ствалоў 107 і 124 см. У лінейнай пасадцы (у выглядзе алеі), якая праходзіць праз парк, захаваліся 13 дрэў хвоі Веймутавай ва ўзросце 100-120 гадоў і вышынёй 32-35 м. Як лічаць даследчыкі, яны з’яўляюцца самымі буйнымі і старымі ў Беларусі. Упрыгожваннем паркавага комплексу з'яўляюцца кедравая алеяі сажалка, якая з'явілася больш 100 гадоў таму.



## 3.Капліца



Руіны капліцы XIX ст., размешчаны на могілках ў аг.Хатляны. Хрысціянская пабудова без спецыяльнага памяшкання для алтара.

Гэта найболей простыя культавыя збудаванні невялікага памера, служба ў якіх праводзілася ў пэўныя дні і святы.

Найпростыя капліцы – гэта драўляныя слупы з крышкамі, пад якімі можа знаходзіцца распяцце, скульптура Маці Божай або малюнак Іаана Хрысціцеля. Лік слупоў магло дасягаць чатырох, тады яны служылі асновай для шатровага даху, прастора пад якой агароджвалася невысокай агароджай. Слупы абшывалі дошкамі з трох ці чатырох бакоў, пераходзячы да больш складанага віду гэтых збудаванняў.

## 4.Шлях з варагаў у грэкі: Хатлянскі маршрут



Рис.1.1 Схема пути из варяг в греки

Шлях з варагаў у грэкі ўзнік у IX ст. У IX ст.нашай эры на Скадынаўскім паўвостраве жылі смелыя мараходы варагі. У Еўропе іх яшчэ звалі нарманамі, вікінгамі. Варагі шукалі шляхі ў развітыя і багатыя землі. Такой краінай была ў той час Візантыйская Імперыя. Са Скандынавіі ў Візантыю можна было праплысці па морах, вакол Еўропы. Але на мелкаводных ялах (караблях) гэты шлях быў доўгі і небяспечны з-за марскіх штормаў. Прасцей і карацей на ялах можна было праплысці па рэках, якія цяклі па славянскіх землях.

Існавалі тры шляхі, якімі можна было трапіць "з вараг у грэкі": рака Волхаў, возера Ільмень, рэкі Лаваць, Заходняя Дзвіна, Днепр, Чорнае мора). Але гэты шлях быў таксама доўгі, ды і судны па сушы перацягваць прыходзілася не раз. Другі Заходне-Дзвінска-Дняпроўскі шлях ляжаў па рэках Заходняя Дзвіна, Днепр, Чорнае мора. Па гэтаму шляху прыходзілася таксама перацягваць суды на сушы. Першыя варагі Аскольд І і Дзір праплылі ля сцен Смаленска ў 863 годзе. Трэці шлях Нёманска-Дняпроўскі (рэкі Нёман, Лоша, Хатлянка, Шаць, Пціч, Прыпяць, Днепр, Чорнае мора). Гэта быў самы кароткі і самы бяс печны шлях. На гэтым шляху ад вятроў не танулі караблі на рэках, не падвяргаліся нападам і нрабяжом пражываючымі на берагах рэк людзі. На гэтым шляху толькі адзін раз з ракі Лоша ў раку Хатлянка прыходзілася перацягваць судны па сушы на бярвенях.

Тут длегласць складала ўсяго каля 4 км. Яшчэ ў сярэдзіне  XX ст. Хатлянка мела шырыню 3-8 м., а глыбіню 3-4 м. Перасохшае русла каля Пярэвалакі і зараз мае шырыню каля 5 м. Тысячу гадоў назад яна была многа шырэй і глыбей. Таму мелкаводныя судны маглі па ёй плысці. Яны мелі 3 м у шырыню, столькі ж у глыбіню і 12 м у даўжыню.

Рака Лоша за Хатлянку больш паўнаводная. Ля Крывялёў  у пачатку  X ст. была пабудавана драўляная плаціна, працаваў вадзяны млын. Ад вёскі Румок пачынаўся сплаш лесу да ракі Нёман і далей  да Стаўбцоў. Урочышча і зараз, дзе заканчвалася перацягванне суднаў з Лошы ў Хатлянку, называецца Пярэвалакай.

Пасля перацягвання суднаў у Хатлянку рух іх запавольваўся. Прыходзілася людзям за вяроўкі, прымацаваныя да суднаў, на некаторых участках ракі прадаўжаць цягнуць іх па вадзе. Рух суднаў запавольваўся, або, як тады казалі "быў ход ляны", гэта значыць "павольны ход". Таму і паселішча людзей, супраць якога судны рухаліся марудна, сталі называцца Хатляны. Жыхары Хатлян яшчэ ў сярэдзіне XX ст. называлі сваю вёску Хотляны, а сябе - хотлянцамі. Толькі ў канцы XX ст. нават старыя людзі сталі называць сваю вёску Хатляны, а сябе - хатлянцамі. На зваротным шляху з Візантыі судны волакам пачыналі цягнуць ад Шаці па Хатлянцы да Пярэвалакі. Месца, да якога цягнулі судны і з якога пачыналі цягнуць на зваротным шляху, называецца Валок. Такая вёска існуе і зараз.



Рис.2.1 Схема Лошанско-Шацкого пути по Н.Азбукину

## 5.Вясельны вянок



Вясельны вянок з воску або васкавы вянок «ЦвЕты» (націск ставяць на першы склад) – традыцыйная частка вясельнага галаўнога ўбору халянскіх нявест у савецкую эпоху. Але, на жаль, ні пісьмовых, ні вусных сведчанняў пра час з'яўлення такіх вянкоў у Хатлянах не захавалася. Калі меркаваць па наяўных фатаграфіях, то можна меркаваць, што васковыя вясельныя вянкі былі папулярнымі ў Хатлянах у савецкі час аж да канца 1960-х гадоў. Вясельныя васкавыя вянкі імітавалі флёрдаранж (фр. fleur d'orange - "кветка апельсіна") - беласнежныя кветкі памяранцавага дрэва з сямейства цытрусавых. Вянок зроблены быў з маленькіх васкавых шышачак-зярнятак, якія нарошчваліся на сцябло з правалокі. Такія шышачкі потым збіраліся ў суквецці, якія разам з лісцем навіваліся на аснову вянка. Вянок таксама быў упрыгожаны невялікімі кветкамі з паперы і тканіны. Для жаніха рабілася бутаньерка ў пару да вясельнага вянка.

## 6.Хатлянскія паясы



У Хатлянскім доме культуры працуе ўзорная студыя “Скарбніца” (кіраўнік Валуевіч Алена Аляксандраўна), якую наведваюць вучні 2-9 класаў. Яны ткуць паясы на бердзечку. Пояс – рэч фенаменальная не толькі ў культуры беларусаў, але і ў культуры народаў усяго свету. Іх знаходзяць пры раскопках, згадваюць у летапісных крыніцах як вельмі дарагія прадметы, якія передаюцца ў спадчыну. Без адмыслова аздобленых паясоў цяжка ўявіць традыцыйны народны касцюм. Пояс у традыцыйнай вопратцы надзяляўся глыбокім сімвалічным сэнсам, прадстаўляючы сабой нейкі круг. Пераходзячы з аднаго круга свайго быцця ў іншы, чалавек мяняў і пояс. Напрыклад, нарадзілася дзіця –яму апраналі хрысцільны паясок-нітачку. Такі пояс насілі ўсё жыццё на голым целе, не здымаючы нават у лазні. Выходзіла дзяўчына замуж – ёй развязвалі дзявочы пояс, выпускаючы з кола, і завязвалі жаночы, упускаючы ў круг замужняй жанчыны. Сыходзіў мужчына на вайну – апранаў пояс воіна, які, па павер'і, надзяляў яго сілай, аберагаў ад бяды. Такім чынам, на працягу жыцця нашы продкі насілі два, часам тры паясы. Пояс выкарыстоўваўся паўсюдна ў якасці абярэга.




Адраджэнне ткацтва паясоў пачалося пасля пераезда ў наш аграгарадок манахіні Васы (Веры Селівончык). Яна з’яўлялася на той момант не толькі адной з вядучых даследвальнікаў традыцыйных беларускіх тэхнік пляцення паясоў, але і высокакваліфікаваным рэканструктарам, аказвая значную дапамогу ў вывучэнні і папаўненні фондаў некаторых музеяў (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей, беларусі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быта.

Пасля смерці манахіні Васы яе справа не спынілася, вучні з задавальненнем наведваюць аб’яднанне па інтарэсах у Хатлянскім Доме культуры і ткуць паясы.

Бердзечка ўяўляе сабой драўляную, пластмасавую альбо металічную пласціну шырынёй 10-20 см і даўжынёй 5-30 см, са шчылінападобнымі адтулінамі. Таўшчыня бердзечка залежыць ад матэрыялу, з якога яно зроблена. Драўляныя бердзечкі звычайна маюць таўшчыню 7-10 см, а металічныя і пластмасавыя бердзечкі, як правіла, танчэйшыя.

Тэхніка ткання на бердзечку нескладаная і заключаецца ў перамяшчэнні бердзечка ўверх-уніз. Пасля кожнага перамяшчэння бердзечка нітка прабіваецца спецыяльнай пласцінкай. Перакладваючы ўточную нітку, неабходна сачыць, каб яна кожны раз зацягвалася аднолькава, інакш выраб будзе няроўны: то шырэйшы, то вузейшы. Асаблівую ўвагу на пачатку работы неабходна звярнуць на шчыльнасць перапляцення нітак. Шчыльнасць на аснове будзе нармальная, калі паміж ніткамі асновы не прасвечваецца ўток. Шчыльнасць па даўжыні выбіраецца адвольна, залежыць ад таўшчыні ўточнай ніткі і ад таго, з якой сілай прыбіваецца ўточная нітка.

Практычна ўсе паясы, якія можна ткаць на бердзечку, можна ткаць і на станку.

## 7.Аляксейчык Мікалай Андрэевіч



Нарадзіўся 25 жніўня 1913 года ў в.Хатляны. Закончыў 4-х гадовую школу ў 1926 годзе. Працаваў у пункце ліквідацыі бязграматнасці і адначасова актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі калгаса імя Дзяржынскага ў Хатлянах у 1929 годзе.

У 1931 годзе паступіў на аднагадзічныя курсы Мінскага педтэхнікума, пасля яго заканчэння працаваў загадчыкам пачатковай школы ў в.Галаўныя Ляды, Бярэзінскага раёна, У 1932 годзе па камсамольскай пуцёўцы накіраваны на вучобу рабфабрыкі пры Ленінградскім аўтадарожным інстытуце. У 1934 годзе паступіў у Ленінградскі аўтадарожны інстытут па спецыяльнасці дарожныя і падымальна-транспартныя машыны, які закончыў у 1940 годзе.

З 1941 па 1946 гады служба ў Чырвонай Арміі. Абараняў Ленінград, удзельнік баёў на Арлова-Курскай дузе, пры Карсунь-Шаўчэнскай і Яска-Кішынёўскай аперацыях. Вызваляў Румынію, Балгарыю, Югаславію, Венгрыю.

Баявыя ўзнагароды: ордэн "Чырвонай Зоркі", пяць медалёў.

Да мірнай працы прыступіў у 1946 годзе начальнікам эксплуатацыі мінскай аўтабазы "Саюззаготтранс". У 1947 годзе паступіў у аспірантуру інстытута сельскай гаспадаркі АН БССР. У 1951 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Механізацыя сельскай гаспадаркі" і да 1959 года працуе ў БІМСГ на пасадах: малодшага навуковага супрацоўніка, загадчыка лабараторыі эксплуатацыі трактароў, намеснікам дырэктара па навуковай частцы.

У 1959 годзе Мінскі абком партыі прапануе М.А.Аляксейчыку на пасаду старшыні калгаса імя Дзяржынскага, дзе ён спалучае навуковую працу з вытворчай. Выканаў вялікую работу па ўздыму гаспадаркі, укараненню комплекснай механізацыі ў раслінаводства і жывёлагадоўлю, ён у канцы 1961 года вяртаецца на працу ў інстытут. Становіцца дацэнтам кафедры, загадчыкам кафедры "Эксплуатацыя машынна-транспартнага парку", адначасова займаецца навуковымі даследаваннямі па павышэнні эфектыўнасці выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі ва ўмовах БССР.

Аляксейчыкам М.А. напісана і апублікавана больш за  50 печатных работ, пад яго кіраўніцтвам выканана пяць  дысертацый кандыдата тэхнічных навук, выдана 10 кніжак, якія шырока выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі інжынерна-тэхнічных работнікаў і механізатараў сельскагаспадарчай вытворчасці.

За стварэнне комплекса машын для сельскай гаспадаркі, навукова-педагагічную дзейнасць М.А. Аляксейчык тры разы (1958, 1960, 1973 г.г.) узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, яго работы на ВДНГ СССР адзначаны 4-мя медалямі, у 1979 г. яму прысуджана Ганаровае званне “Заслужаны інжынер сельскай гаспадаркі Беларускай ССР”.

М.А.Аляксейчык трымаў пастаянную сувязь са школай, прысутнічаў на ўрачыстых мерапрыемствах, выступаў перад вучнямі і настаўнікамі.

Памёр у 1983 годзе, пахаваны ў Хатлянах.

# 8.Бялевіч Антон Пятровіч



Нарадзіўся 14 мая 1914 года ў в.Дуброўка, закончыў няпоўную сямігадовую школу ў 1928 годзе.

Пачаў працаваць загадчыкам хаты-чытальні пры Сельскім Савеце і пункце ліквідацыі бязграматнасці, адначасова навучаўся ў магілёўскім педтэхнікуме. Адчуўшы недахоп ведаў, у 1933 годзе паступіў на масавы факультэт Магілёўскага інстытута палітсавета. Пасля заканчэння інстытута ў 1935 годзе А.П.Бялевіч працуе загадчыкам аддзела Пухавіцкай раённай газеты "За калгасы" і друкуе свае нарысы ў газетах "Чырвоная Змена", "Звязда". У 1936 годзе кіраўніцтва газеты абвінілі ворагамі ўлады і закрылі. А.П.Бялевіч працаваў кладаўшчыкам у райпрам-камбінаце, а ў 1937-1939 г.г. нарысістам у газетах "Чырвоная Змена", "Звязда".

У гады Вялікай Айчыннай вайны працуе на радыё і рэдакцыі ілюстраванага выдання "Раздавім фашысцкую гадзіну" у г.Мінску. У 1942 годзе цэнтральным штабам партызанскага руху з групай беларускіх паэтаў і пісьменнікаў накіраваны ў тыл ворага для асвятлення ў друку баявых дзеянняў партызан. Творы ваеннага часу А.П.Бялевіча друкуюцца у беларускіх выданнях, газеце «Известия», часопісе «Новый мир». У 1943 годзе А.П.Бялевіча прымаюць у саюз пісьменнікаў СССР, а ў 1944 годзе выйшаў у Маскве яго першы паэтычны зборнік "Чалавек з Дубравы".

А.П.Бялевіч напісаў 30 кніжак вершаў, паэм, нарысаў, у тым ліку 2 кніжкі для дзяцей "Тарасікава дарожка", "Дабрадзейны асілак".

А.П.Бялевіч шмат часу аддаваў перакладніцкай працы з польскай і рускай мовы твораў Міцкевіча, Твардоўскага, Бажаны, Малышкі і інш. На яго вершы напісаны песні кампазітарамі А.Багатыровым і Я.Цікоцкім.

У 1978 годзе А.П.Бялевіч падрыхтаваў апошні зборнік сваіх вершаў "Сасна ў жыццё", які надрукаваны пасля яго смерці.

Памёр А.П.Бялевіч у 1978 годзе. Пахаваны ў Мінску. Ва Узде адна з вуліц названа яго імем.

# 9.Махнач Аляксандр Сямёнавіч



Нарадзіўся 08.02.1918 года ў в.Хатляны. Пасля заканчэння ў 1934 годзе Хатлянскай сямігодкі, паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум, а ў 1935 годзе перайшоў вучыцца на рабфак станцыі Негарэлае. Студэнтам факультэта геаграфіі Мінскага педагагічнага інстытута стаў у 1936 годзе. Вучобу ў інстытуце спалучаў з працаю у школе рабочай моладзі № 5 г.Мінска, а на 4 курсе Наркамасветы БССР яго накіроўвае на працу ў сельскую школу в.Рудня Чэрвеньскага раёна. Прышлося працаваць і адначасова прадаўжаць вучобу. У чэрвені 1940 года А.С.Махнач на "выдатна" закончыў інстытут, а ў восень прызываецца ў Чырвоную Армію.

Прайшоў усю вайну ў складзе Паўднёва-Заходняга, Сталінградскага і 1-га Украінскага франтоў. Абараняў і вызваляў спачатку родную зямлю, потым Польшчу, Чэхаславакію, штурмаваў Берлін і Прагу. Вайну закончыў маладым лейтэнантам. Быў салдатам, камандзірам аддзялення, намеснікам камандзіра батарэі, камандзірам батарэі. Баявыя ўзнагароды: Ордэн "Чырвонай Зоркі", медалі "За адвагу", "За вызваленне Прагі", "За ўзяцце Берліна", "За Перамогу над Германіяй" і інш.

Да мірнай працы А.С.Махнач вярнуўся ў 1946 годзе. Працаваў кансультантам Міністра адукацыі БССР, намеснікам загадчыка аддзела ЦКВЛКСМБ па рабоце з піянерамі і школьнікамі, а ў 1947 годзе паступіў у аспірантуру пры Акадэміі Навук БССР па спецыяльнасці "Літалогія". Адначасова закончыў завочна нафтавы інстытут у Маскве і пачаў работу над кандыдацкай дасертацыяй, якую абараніў у 1950 годзе.

Усё жыццё прысвяціў вывучэнню нетраў Беларусі, яе багаццяў. У 1959 годзе за глыбокае даследаванне старажытных ледніковых фармацый А.С.Махначу прысуджана вучоная ступень доктара геолага-мінералагічных навук, прысваенне звання прафесара па спецыяльнасці "Літалогія". Ён актыўна ўдзельнічае ў адкрыцці на тэрыторыі Беларусі радовішчаў калійных і каменных солей, жалезных руд, гаручых сланцаў, іншых карысных выкапняў. За адкрыццё нафтавых залежаў у Прыпяцкай упадзіне стаў у 1972 годзе лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР. За кіраўніцтва работамі па даследаванню нетраў Беларусі А.С.Махнач два разы ўзнагароджаны Міністэрствам геалогіі СССР значком "Выдатнік разведкі нетраў", а галоўны камітэт ВДНГ СССР два разы ўзнагародзіў сваёй высшай узнагародай "Дыпломам Гонару". Прызнанне заслуг А.С.Махнача

з’явілася выбранне яго ў 1959 годзе членам-карэспандэнтам, а ў 1970 годзе – акадэмікам АНБССР. Яму прысвоена званне “Заслужаны дзеяч навукі Беларусі” і Ганаровым членам Расійскай акадэміі навук.

За заслугі ў развіцці геалагічнай навукі і вялікі ўклад ва ўмацаванне мінеральна-сыравіннай базы А.С.Махнач узнагароджаны ордэнамі “Леніна”, “Працоўнага Чырвонага Сцяга”, “Знак Пашаны”, “Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровымі Граматамі АНБССР, ЦК ВЛКСМ і др.

А.С.Махнач быў часта ў школе, выступаў перад настаўнікамі і вучнямі, прысутнічаў на школьных мерапрыемствах.

Памёр у 2006 годзе.

# Карта-схема







1 – Свята-Пакроўская царква
2 - Сядзібна-паркавы комплекс памешчыка Грабоўскага
3 – Капліца
4 - Шлях з варагаў у грэкі: Хатлянскі маршрут
5 - Вясельны вянок
6 - Хатлянскія паясы
7 - Аляксейчык Мікалай Андрэевіч
8 - Бялевіч Антон Пятровіч
9 - Махнач Аляксандр Сямёнавіч

## Спіс літаратуры


1. Інфармацыя народнага краязнаўчага музея “Хатляны: ад мінулага да сучаснага” дзяржаўнай установы адукацыі “Хатлянская сярэдняя школа” Уздзенскага раёна.
2. Манахіня Васа (Селівончык), Беларускія народныя паясы. Тэхнікі вырабу. Арнамент – Мінск “Беларуская навука”. - 2014
3. Селівончык, В.І “Ткацтва на дошчачках: практ. Дапам. /В.І.Селівончык.-Мінск,2009
4. Лазар М.К. “Хатляны”, Мінск : Кнігазбор, 2008